# Чым аралі нашы продкі?

М. АПЕЙКА, бібліятэкар БАТУ

З "Краткого обзора деятельности земств Минской губернии в первом трехлетии", апублікаванага ў "Вестнике Минского губернского земства" за 1914 год, даведваемся пра актыўную дзейнасць гэтай арганізацыі у агранамічнай галіне.

У 1911 годзе у Мінскай губерні былі адчынены земскія збожжаачышчальныя склады і пункты, а ў дадатак да таго ў Мінскім павеце, напрыклад, існавала 4, а ў Ігуменскім — 8 пракатных станцый па пракату сельскагаспадарчых машын.

Вялікаю ўвагаю Мінскага земства карысталіся адукацыйныя формы арганізацыі рынка сельскагаспадарчай тэхнікі: курсы па розных галінах сельскай гаспадаркі, спецыяльныя бібліятэкі, узаемныя экскурсіі па абмену перадавым вопытам гаспадарання (з публікацыяй справаздач удзельнікаў гэтых экскурсій).

У Мінску існавалі месячныя курсы па сельскай гаспадарцы, дзе лекцыі чыталі супрацоўнікі Мінскай Балотнай станцыі А.Ц. Кірсанаў, Б.А. Ганжа, аграном губернскай землеўладкавальнай камісіі М.Ф. Сцяпура, урадавыя спецыялісты сельскай гаспадаркі А.В. Вельямінаў-Зярноў, А.А. Сядлецкі, С.С. Шцюрцер, П.І. Бруевіч, І.Я. Некляпаеў, ветэрінарны лекар губерні Л.Г. Галынец, інспектар дробнага крэдыту А.А. Батура.



*Шпульны высявальны прыбор Гузьера (2-я палова XIX ст.).*

*Шведская барана (2-я палова XIX ст.).*



Яны выкладалі наступныя дысцыпліны: агульнае земляробства (17 гадзін), прыватнае земляробства (20 гадзін), сенажатніцтва і культура балот (13 гадзін), жывелагадоўля (20 гадзін), ветэрынарыя (10 гадзін), арганізацыя гаспадаркі і сельскагаспадарчая кааперацыя (14 гадзін).

У 1910 годзе Бабруйская школа садоўніцтва была пераўтворана ў сельскагаспадарчую вучэльню, а ў мястэчку Азарычы Бабруйскага павета была створана сельскагаспадарчая школа.

Выкарыстанне коннага прывада, асабліва на стацыянарных устаноўках накшталт конных малацілак, патрабавала зменных каней, а гэта азначае, што селянін, які меў аднаго ці двух каней, наўрад ці мусіў карыстацца такою машынаю.

Па Вайскова-конскім перапісе 1900 года ў Мінскай губерні было 16289 сялянскіх двароў з трыма коньмі, з чатырма — 5418, з пяццю — 1825, а сялянскіх двароў, дзе было болей пяці каней, налічвалася 1077.

Цікава, што конных малацілак у сялян Мінскай губерні было 9266, а двароў, дзе мелася чатыры і болей каней, — 8320. Гэта

*Працяг. Пачатак у №1 за 1997 г.*



*Плуг Сака з дзерназдымалам (2-я палова XIX ст.).*

азначае, што 946 коннымі малацілкамі валодалі сяляне, якія мелі па тры кані на двор.

З агульнай колькасці 1413 сеялак 1407 такіх машын у Мінскай губерні належала панскім гаспадаркам. Для параўнання: у Магілеўскай губерні толькі адна з 673 сеялак належала сялянскай гаспадарцы.

З 1447 жняярак 1429 гэткіх машын у Мінскай губерні належалі памешчыкам (у Магілеўскай губерні з 333 жняярак толькі 8 былі сялянскімі).

Паравых малацілак у Мінскай губерні было 151 — і ўсе панскія, а ў Магілеўскай губерні іх было 79.

Конных малацілак у Мінскай губерні было 13860, з іх сялянам належала 9266 машын, панскім гаспадаркам — 4594, у той час, калі ў Магілеўскай губерні з 2237 такіх машын толькі 1028 было сялянскіх.

Такім чынам, арганізацыя рынка сельскагаспадарчай тэхнікі ішла як па шляху сельскагаспадарчай адукацыі, прапаганды тэхнічных ведаў на курсах, у ніжэйшых і сярэдніх спецыяльных установах, гэтак залежала і ад чыста эканамічных фактараў.

І, вядома, узровень механізацыі сельскай гаспадаркі залежаў ад узроўню развіцця шляхоў зносін, не ў апошнюю чаргу, чыгункі і паштовых трактаў.

У Мінскай губерні, як вядома, вялікая сетка чыгункі і паштовых трактаў стымулявала развіццё ўсіх галін эканомікі, у тым ліку, і сельскай гаспадаркі. Само геаграфічнае становішча гэтай губерні на перакрыжаванні, больш таго, у цэнтры перакрыжавання шляхоў з Захаду на Ўсход і з Поўдня на Поўнач было моцным фактарам развіцця.

І таму слушна было заўважана як С.М. Леніным, вядомым даследчыкам механізацыі сельскай гаспадаркі Расійскай імперыі, гэтак і У.І. Леніным [1], што Мінская губерня ішла па ўзроўню развіцця сельскай гаспадаркі далёка наперадзе Магілеўскай.

У далейшых публікацыях будуць гэтаксама прааналізаваны ўзроўні развіцця механізацыі сельскай гаспадаркі Віленскай, Віцебскай і Гродзенскай губерань.

1. Ленин В.И. Развитие капитализма в России. Процесс образования внутреннего рынка для крупной промышленности. - СПб: Изд-во М. Водовозовой, 1899. Полное собрание сочинений. - Т. 3. - С. 188.

2. Ленин В.И. Аграрный вопрос в России XIX века. Полное собрание сочинений. - Т. 17. - С. 76, 79.

*Радавая сеялка (2-я палова XIX ст.).*

